# Нацыянальная культура Беларусі

... Народная творчасць беларусаў складае
наша вялікае багацце, якім беларусы могуць
ганарыцца. Яго павінны падтрымліваць і захоўваць.

*Доўнар-Запольскі М. Д.*




***Бялявіна, В.М. Жаночы касцюм на Беларусі : научное издание / В. М. Бялявіна, Л. В. Ракава. – Мінск : Беларусь, 2007. – 351 с. : іл.***

У кнізе ўпершыню на аснове разнастайных гістарычных крыніц (старажытных летапісаў, хронік, актавых дакументаў XV—XVIII стст. і інш.), этнаграфічнай і этналінгвістычнай літаратуры XIX-XX стст. комплексна, ва ўсёй сваей шматварыянтнасці паказан працэс развіцця жаночага касцюма розных сацыяльных слаёў насельніцтва Беларусі з глыбокага мінулага да сучаснасці.



Багата ілюстраванае выданне разлічана на гісторыкаў, этнолагаў, мастацтвазнаўцаў і шырокае кола чытачоў, якія цікавяцца гісторыяй і культурай беларускага народа.



**Змест**

Касцюм прывілеяванага саслоўя і гараджанак
Сялянскі касцюм
Плечавое і паяснае адзенне
Верхняя вопратка
Галаўныя ўборы
Абутак
Аксесуары



---




***Лабачэўская, В.А. Повязь часоў - беларускі ручнік = Bond of times - belarusian towel : альбом / В. А. Лабачэўская. – Мінск : Беларусь, 2009. – 298 с. : іл.***

Альбом «Повязь часоў — беларускі ручнік» знаёміць з выдатнай з’явай нацыянальнай культуры Беларусі — традыцыйнымі і сучаснымі ручнікамі. Каляровыя фотаздымкі 220 ручнікоў і канца XIX — XX стагоддзя са збораў 11 музеяў Беларусі дэманструюць высокія мастацкія дасягненні беларускіх сялянак у ткацтве, вышыўцы, карункапляценні. Упершыню ў гэтым альбоме беларускі ручнік паказаны ў паўнаце сваіх рэгіянальных і лакальных



мастацка-кампазіцыйных і арнаментальных адметнасцей. Прадстаўлены 44 лакальных тыпы ручнікоў усіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі — Заходняга Палесся, Усходняга Палесся, Падняпроўя, Цэнтральнай Беларусі, Паазер’я, а таксама пазнейшыя вышываныя ручнікі, якія адлюстроўваюць працэс разбурэння і нівеліроўкі этнічнай спецыфікі ў традыцыйным народным мастацтве.

Амаль на кожнай старонцы ілюстрацыі, фотаздымкі.



*Ручнік — рэч глыбока сімвалічная, шматзначная. Вышываная, узорыста вытканая тканіна здольная выклікаць у нас шмат пачуццяў і асацыяцый. Выраблены паводле законаў мастацтва, ручнік упрыгожвае паўсядзённасць і адначасова застаецца сімвалічным напамінам аб нябачных сувязях, што знітоўваюць асобнага чалавека з Богам, ягоным родам, продкамі. Сваёй прысутнасцю ў хатнім чырвоным куце ці ў царкве на абразах, на прыдарожным ці надмагільным крыжы ручнік адзначае тую прастору, у якой чалавек праз словы малітвы здольны ўзняцца да спасціжэння складаных сувязяў з Сусветам.*

*(З прадмовы да выдання)*

**Змест**

Повязь часоў
Вобразная семантыка ручніка
Ручнікі Заходняга Палесся
Ручнікі Усходняга Палесся
Ручнікі Падняпроўя
Ручнікі Паазер’я
Ручнікі Цэнтральнай Беларусі
Ручнікі Панямоння

---




***Репина, Т.А. Художественные изделия из соломки : справочное издание / Т. А. Репина. – Минск : Беларусь, 2008. – 287 с. : ил.***



Книга знакомит читателя с искусством соломоплетения и аппликации соломкой. Особое внимание уделено развитию этих видов народного искусства в Беларуси. Впервые в одном издании собран многовековой опыт мастеров соломоплетения и аппликации, показано все многообразие художественных приемов работы с соломкой.

Издание может быть полезно всем, кто интересуется искусством плетения и аппликации соломкой.





---




***Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь. Мастацтва XV - пачатку XX стагоддзя = Национальный художественный музей Республики Беларусь. Искусство XV-начала XX века = The National Art Museum of the Republic of Belarus. The 15th - early 20th Century Art : репродукции / сост.: Ю. А. Піскун, Н. Ф. Высоцкая, А. У. Карпенка. – 2-е выд. – Мінск : Беларусь, 2006. – 335 с. : іл.***

Альбом збораў Нацыянальнага мастацкага музея пазнаёміць аматараў мастацтва з разнастайнымі калекцыямі музея, з найкаштоўнейшымі творамі збору выяўленчага мастацтва, з беларускім народным мастацтвам, дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам краін Еўропы, Расіі і Усходу.



**ЗМЕСТ**



З гісторыі музея і яго збораў. *Ю. А. Піскун*

МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ XV – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ
Іканапіс і драўляная пластыка XV – пачатку XVIII стагоддзяў. *Н. Ф. Высоцкая*
Партрэтны жывапіс канца XVI – пачатку XIX стагоддзя. *А. У. Карпенка*
Мастацтва XIX – пачатку XX стагоддзя. *Н. М. Усава*

МАСТАЦТВА КРАІН ЕЎРОПЫ XVI – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ І РАСІІ XVIII – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ
Мастацтва краін Еўропы XVI – пачатку XX стагоддзя. *Т. І. Карандашава*
Мастацтва Расіі XVIII – пачатку XX стагоддзя. *Т. А. Рэзнік, А. К. Рэсіна*
Спіс ілюстрацый
Паказальнік імён



---




***Сахута, Я.М. Беларуская выцінанка: научно-популярная литература / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларусь, 2008. – 230 с. : іл.***

У гісторыі нацыянальнай культуры ёсць нямала амаль забытых відаў народнай творчасці, якія апошнім часам выклікаюць ўсё большую цікавасць, што стымулюе іх адраджэнне і развіццё. У поўнай меры гэта тычыцца выцінанкі. Цяпер яна — неад’емны элемент разнастайных выставак, ёю займаюцца ў дзіцячых садках, школах, студыях, дамах рамёстваў.

У прапануемай, багата ілюстрванай кнізе абагульнены і гісторыя, і сучасны стан, і мастацкія асаблівасці, і нацыянальныя адметнасці беларускай выцінанкі.

Для шырокага кола чытачоў.

*Вытинанка (“выцінанка”, “выразанка”, “выразка”, “выстрыганка”, “выбіванка”) – вид народного декоративно-прикладного искусства, ажурный узор, вырезанный из чёрной, белой или цветной бумаги; а также техника традиционного вырезания из бумаги.*



**ЗМЕСТ**

Уводзіны
**Мастацтва папяровых выразак: ад Кітая да Беларусі**
**Сучасная беларуская выцінанка**
**Вядучыя майстры выцінанкі**
Belarusian Wytsinanka / пераклад І. Дз. Галяшэвіча
Літаратура





---




***Баразна, М.Р. Мастацтва кнігі Беларусі XX стагоддзя = Искусство книги Беларуси XX века = Belarus` Art of book publishing of the 20th century : научно-популярная литература / М. Р. Баразна. – Мінск : Беларусь, 2007. – 239 с. : іл.***

Выданне раскрывае станаўленне і развіццё вядомай не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі школы мастацтва кнігі. Яно ўключае творы мастакоў розных пакаленняў, адлюстроўвае розныя творчыя тэндэнцыі і стылістыкі. Найбольшы поспех мастацтва кнігі Беларусі прыходзіцца на другую палову XX стагоддзя.

У выданні змешчаныя ўнікальныя матэрыялы мастацка-выдавецкай практыкі, раней не прадстаўленыя шырокаму колу чытачоў.



МАСТАК НЕ ЎКАЗАНЫ.
*Тарас Гушча (Я. Колас). У ціхай вадзе. 1925.* Вокладка

МАСТАК НЕ ЎКАЗАНЫ.
*Р. Старшы. Змаганне за агонь. 1929.* Вокладка

сы і газеты. Літаратурна-мастацкую частку пытанняў вырашаў часопіс «Маладняк» (1924–1926), які меў свае філіялы ў Полацку, Бабруйску, Оршы, Калінкавічах. У афармленні гэтых часопісаў прымалі ўдзел маладыя таленавітыя мастакі П. Гуткоўскі, В. Дваракоўскі, А. Пузынкевіч, А. Тычына. «Маладняковец» стаў сінонімам усяго новага, перадавога, што стваралася на ніве творчасці. Узнёсласць, рамантычнасць у адносінах да сучаснасці ўвасаблялася ў вобразе маці над калыскай дзяцяці, «кліна», што выбівае з жыцця непатрэбнае, рукі з сярпом, што, падхапіўшы заслону сцэны, адчыняе прасторы мастацтву. Сімвалы – бярозавы гай, разгалісты дуб, зоркі і промні, маторы, самалёты, электрычныя лямпачкі – усё сведчыла аб з'яўленні новага пакалення мастакоў, што прыйшло на змену «нашаніўцам», каб «давяршыць і абнавіць» справу мастацка-паэтычнай плеяды 1905 года».

Праз газеты і часопісы мастакі змаглі прадэманстраваць тыя прынцыпы афармлення, якія яны распрацавалі для кніжных выданняў, многія з якіх так і не выйшлі ў свет.

Слабая паліграфічная база таго часу не дазваляла раскрыць уздым развіцця выяўленчага мастацтва праз якасныя ілюстрацыі, дэкаратыўныя элементы і стала адной з прычын таго, што кніжнае мастацтва было зведзена да афармлення адных толькі вокладак, якія ў сваёй большасці асацыіруюцца з творамі нагляднай агітацыі – плакатамі, створанымі з дапамогай плоскіх каляровых плашак, а таксама з беспрадметным жывапісам супрэматыстаў.

Мяняецца прынцып выкарыстання шрыфту. З другараднага, дадаткова-інфармацыйнага элемента ён становіцца раўнапраўным і актыўным элементам кампазіцыі вокладкі, тытульнай старонкі. Мастакі ўводзяць у кампазіцыі падкрэслена геаметрызаваныя шрыфты і маляваныя. Надпісы размяшчаюць па вертыкалі, пад нахілам.

У другой палавіне 1930-ых гадоў пад уціскам ідэалагічнай палітыкі, скіраванай супраць ідэй аван-






---




***Сакральная живопись Беларуси XV-XVIII веков = Сакральны жывапіс Беларусі XV- XVIII стагоддзяў = The painting sacred of Belarus XV-XVIII centures : репродукции / сост. Н. Ф. Высоцкая ; ред. Т. В. Габрусь [и др.]. – Мінск : Беларусь, 2007. – 218 с. : іл.***

Книга посвящена сакральной живописи Беларуси XV-XVIII веков. Создание ее стало возможным только после реставрации ведущими специалистами Беларуси, России, Польши как памятников из музейных коллекций, так и алтарных картин, сталей, алтарей, икон, иконостасов, ферентронов в самих храмах...



В альбом вошли репродукции экспонатов, многие из которых находятся в культовых коллекциях Беларуси и России. Некоторые из них ранее нигде не публиковались. Это и памятники из музейных коллекций, алтарные картины, иконы, иконостасы, которые находятся в храмах. По сути, книга - первый полный альбом произведений сакральной живописи в Беларуси XV-XVIII веков.







---




***Сучасны беларускі жывапіс. XXI стагоддзе. = Современная белорусская живопись. XXI век. = Modern belarusian painting. XX century. : альбом / склад. К. С. Аксёнава. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2010. – 432 с. : il.***

У альбоме шырока прадстаўлены самыя вядомыя і цікавыя работы 100 беларускіх жывапісцаў сучаснасці — як мэтраў беларускага жывапісу, якія ўплываюць на фарміраванне і развіццё сучаснага выяўленчага мастацтва, так і маладых творцаў.

"Мы не імкнуліся поўнасцю ахапіць творчасць кожнага з прадстаўленых мастакоў, - распавядае ўкладальнік выдання, намеснік дырэктара выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя" імя П.Броўкі Кацярына Аксёнава. - Мэта гэтага альбома - паказаць багацце і шматграннасць сучаснага беларускага жывапісу ў цэлым. Калі ж чытач зацікавіцца творамі пэўнага майстра, то лёгка можа знайсці іншыя яго работы: для гэтага разам з рэпрадукцыямі і кароткай біяграфіяй у выданні змешчаны асабістыя web-сайты і электронныя адрасы жывапісцаў".



У выданне ўключана больш за 500 жывапісных палотнаў, змешчаны творчыя біяграфіі мастакоў, даецца інфармацыя аб мастацкіх музеях, галерэях, выставачных залах і цэнтрах краіны, дзе рэгулярна праводзяцца мастацкія выставы.

Выдаўцы змясцілі ў томе і інфармацыю пра мастацкія музеі, галерэі і выставачныя залы, дзе рэгулярна ладзяцца экспазіцыі.




***Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь: мастацтва 1920-1950-ых гадоў = Национальный художественный музей Республики Беларусь. Искусство 1920-1950-х годов = The National Art Museum of the Republic of Belarus. The 1920-1950 years Art : репродукции / склад. В. А. Архіпава [и др.]. – Мінск : Беларусь, 2006. – 395 с.***

Кніга прысвечана зборам аднаго з найцікавейшых перыядаў гісторыі савецкага мастацтва – мастацтву Беларусі і Расіі 1920-1950-ых гадоў.

Альбом знаёміць аматараў мастацтва з 340 рэпрадукцыямі жывапісу, скульптуры і ўпершыню – дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва больш чым за 200 мастакоў.



Карціны адлюстроўваюць рэвалюцыйны дух сацыялістычнага эксперымента, пафас будаўніцтва новага грамадства, подзвіг народа ў Вялікай Айчыннай вайне і энтузіязм пасляваеннага аднаўлення.





